пестке рисуют то, что укрепляет их здоровье. Можно выполнять совместно с родителями. Данная страница заключительная – это итог всей предшествующей работы.

Отметим, что ценность записей в «Календаре здоровья» не в их правильном оформлении, а в содержании.

Таким образом, целостная здоровьесберегающая система позволяет привлекать ребенка своим деятельностным, игровым и тренирующим содержанием, включать в работу родителей, педагогических работников учреждений дошкольного образования. И только в этом случае возможно довести до сознания воспитанников значимость и необходимость выполнения определенных действий, направленных на сохранение и укрепление здоровья, и сформировать ценностное отношение не только к собственному здоровью, но и здоровью окружающих людей.

**Список литературы**


1. Глазырина, Л.Д. Физкультурные занятия в группе «Фантазеры»: пособие для педагогов учреждений, обеспечивающих получение дошк. образования / Л.Д. Глазырина. – Минск: Зорны Верасок, 2012. – 240 с.
2. Куксова, Н.А. Модель здорового образа жизни / Н.А. Куксова // Пралеска. – 2015. – № 6. – С. 14–33.
3. Учебная программа дошкольного образования для учреждений дошкольного образования с русским языком обучения и воспитания / Министерство образования Республики Беларусь. – Минск: Нац. ин–т образования, 2019. – 467 с.
4. Шебеко, В.Н. Творчество дошкольников в двигательной деятельности / В.Н. Шебеко // Пралеска. – 2007. – № 10. – С. 24–32.
5. Шишкина, В.А. Двигательное развитие дошкольника: пособие для педагогов и руководителей учреждений дошкольного образования / В.А. Шишкина. – Минск: Нац. ин-т образования, 2011. – 133 с.


*Дата поступления в редакцию: 29.08.2022*

# АРГАНІЗАЦЫЯ ГРУПАВОЙ РАБОТЫ ВУЧНЯЎ СРОДКАМІ ІНТЭРАКТЫХ МЕТАДАЎ І ПРЫЁМАЎ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

*Раманоўская Марыя Пятроўна*

***Анатацыя.*** *Сфарміраванае ўменне працаваць у камандзе – адно з патрабаванняў да метапрадметных вынікаў асваення зместу адукацыйнай праграмы агульнай сярэдняй адукацыі. Уменне працаваць у камандзе, ці калабарацыя, – адна з ключавых кампетэнцый сучаснага чалавека. На вучэбных занятках па беларускай мове сродкамі інтэрактыўных метадаў і прыёмаў можна арганізаваць працэс вучнёўскага ўзаемадзеяння, накіраваны на павышэнне якасці навучання, самапазнанне, самаразвіццё школьнікаў, якім сёння неабходна ўсвядоміць значнасць адукацыі для асобаснага станаўлення і самавызначэння.*

Сучасная педагогіка разглядае адукацыю як працэс, які накіраваны на самаразвіццё асобы вучня, на пашырэнне яго магчымасцей кампетэнтнага выбару свайго жыццёвага шляху. У адпаведнасці з актуальнымі запатрабаваннямі грамадства галоўнай задачай школы з'яўляецца падрыхтоўка адукаванага і творчага грамадзяніна, здольнага да пастаяннага самаразвіцця.

Зразумела, што нельга навучыць школьніка, калі ён гэтага не хоча і не бачыць патрэбы ў набыцці ведаў, таму перад кожным настаўнікам стаіць пытанне: як вучыць, каб павысіць эфектыўнасць сучаснага ўрока для кожнага вучня, якія сродкі для гэтага падабраць? Даваць веды – задача складаная. Але яшчэ цяжэй дапамагчы вучням дасягнуць такога ўзроўню, каб яны адчулі сябе творчымі, актыўнымі і патрэбнымі ў грамадстве [3].

Поспех у гэтым накірунку магчымы пры супадзенні дзвюх асноўных умоў: наяўнасці ўстойлівай пазнавальнай цікавасці вучняў да матэрыялу, які вывучаецца на ўроку (вучань вучыцца не для настаўніка, не для бацькоў, а для сябе, матэрыял урока неабходны менавіта яму), майстэрства настаўніка так арганізаваць дзейнасць, каб усе вучні на ўроку, абапіраючыся на свае патэнцыяльныя магчымасці і ўжо атрыманыя веды, самастойна вырашалі вучэбныя сітуацыі, праблемы ў працэсе ўзаемадзеяння: ”вучань-інфармацыя“, ”вучань–веды“, ”вучань–праблемы“, ”вучань–вучань“, ”вучань–група“ і іншыя (кожны вучань на ўроку можа заняць актыўную асобасную пазіцыю і ў поўнай ступені праявіць сябе як суб'екта вучэбнай дзейнасці) [1; 2; 4].

Злучыць гэтыя дзве ўмовы на практыцы настаўніку беларускай мовы дазваляе выкарыстанне інтэрактыўных метадаў і прыёмаў навучання.

Інтэрактыўныя метады і прыёмы пры эфектыўным іх прымяненні дазваляюць рэальна мяняць сітуацыю ў адукацыйным працэсе: актывізуюць пазнавальную дзейнасць вучняў; стымулююць матывацыю і цікавасць да навучання; развіваюць творчую актыўнасць і самастойнасць; ствараюць умовы для гарманічнага развіцця асобы.

Інтэрактыўныя метады і прыёмы навучання ў настаўніцкай працы аказаліся практычнай дзейнасцю, якая дае добрыя вынікі, дапамагае вучням засвойваць вучэбны матэрыял па беларускай мове, дазваляе разнастаіць пазакласную працу па прадмеце.

Выкарыстанне на ўроках інтэрактыўных метадаў і прыёмаў прадугледжвае арганізацыю групавой формы работы вучняў: вучань становіцца актыўным тады, калі працуе ў камандзе. Дзеці таксама станоўча ацэньваюць гэты від працы, адзначаюць, што паступова з'яўляецца ўпэўненасць у сабе, сыходзіць страх, нерашучасць, актывізуецца мысленне.

Спачатку для некаторых вучняў сітуацыя можа стаць стрэсавай: складана гаварыць, выказваць сваё меркаванне, адказваць па тэме ўрока абавязкова, а прэзентаваць працу групы можа выпасці абсалютна любому. Гэта вельмі адказна, бо твая падрыхтоўка непасрэдна ўплывае на адзнаку ўсёй групы. Таму ўсе зацікаўлены ў найлепшым выніку. Вучні з высокім узроўнем вучэбных дасягненняў, працуючы ў групе, правераюць на сабе правільнасць высновы, што "навучаючы іншых, мы вучымся самі". Акрамя таго, яны атрымліваюць магчымасць пастаянна актыўна практыкавацца ў сваіх ведах. Слабейшыя дэманструюць веды ў сітуацыі, якая для іх з'яўляецца якраз менш стрэсавай (слухаюць усяго 3–4 вучні). З цягам часу дзеці пачынаюць трымацца больш разняволена, і ўрок дае магчымасць атрымаць ад працы маральнае задавальненне, а не стомленасць. Настаўнік жа выступае як арганізатар самастойнай дзейнасці вучняў, як кансультант. Існуюць розныя спосабы аб'яднання вучняў у групы, якія дазваляюць хутка і эфектыўна пачаць работу.

Вучыць пісаць без памылак, умець правяраць напісанае, бачыць арфаграму дапамагае ідэя метаду "Сонейка".

На асобных картках (6×15) пішуцца назвы арфаграм. *Напрыклад, "Правапіс падоўжаных зычных", "Правапіс галосных у складаных словах", "Правапіс суфікса -ск- у прыметніках" і г.д.* Для кожнай групы рыхтуюцца карткі з аднымі і тымі ж надпісамі, але рознага колеру. Групы атрымліваюць тэкст з адным і тым жа зместам і заданне: адшукаць усе магчымыя арфаграмы. Праз пэўны прамежак часу прадстаўнікі ад кожнай групы збіраюцца на свабодным месцы ў класе і на сталах выкладваюць "сонейкам" тыя карткі, якія арфаграмы ім удалося адшукаць.

Станоўчае ў гэтым метадзе тое, што ў працы задзейнічаны ўсе вучні, выпрацоўваецца ўменне пазнаваць арфаграму, успамінаць канкрэтнае правіла (адначасова паўтараецца даўно пройдзены матэрыял), выпрацоўваецца ўважлівасць. Прычым, калі ўсе карткі раскладзены, бачна, што нейкая група не адшукала словы на правапіс, напрыклад, канчаткаў назоўнікаў мужчынскага роду ў родным склоне, нехта не заўважыў, што ёсць прыслоўі і т.п. Праца працягваецца. Тое ж можна рабіць і з правіламі на пастаноўку знакаў прыпынку.

Выкарыстанне метаду "Адгадай" пры вывучэнні граматычных катэгорый розных часцін мовы дазваляе не толькі праверыць узровень ведаў, але і садзейнічае развіццю ўмення вучняў дакладна фармуляваць пытанні, развівае лагічнае мысленне, патрабуе дакладных ведаў па вучэбным матэрыяле. Трэба не толькі скласці пытанне (-і), каб даведацца, што за картка ў сяброў, але і добра арыентавацца ў вывучаным матэрыяле, каб даволі хутка самім даць адказ на пытанне.

Возьмем, напрыклад, тэму "Прыметнік". Пасля таго, як вывучана пэўная частка матэрыялу або ўся тэма, групы вучняў атрымліваюць карткі з надпісамі "Якасныя прыметнікі", "Прыналежныя прыметнікі", "Кароткія прыметнікі" і заданне: на працягу 5 хвілін скласці 5 пытанняў (пажадана "закрытага тыпу"), якія дазволяць групе вызначыць свой тэрмін. Калі метад выкарыстоўваецца ўпершыню або дзейнасць арганізуецца для пяцікласнікаў, то больш часу ідзе на складанне пытанняў. Для дзяцей становіцца відавочным, наколькі важна бывае правільна задаць пытанне і наколькі грунтоўна трэба ведаць матэрыял, каб сфармуляваць пытанне, даць адказ на яго пры дапамозе толькі двух слоў "так" ці "не". Адзінае, што варта ўлічваць: вучні не любяць вучыць правілы, тэмы з вялікай колькасцю тэрмінаў (тым больш, што іх у кожным прадмеце вялікае мноства).

Выкарыстанне метаду "Адгадай" спрыяе засваенню граматычнай тэрміналогіі і асаблівасцей часцін мовы пры вывучэнні марфалогіі.

Для прадуктыўнага завяршэння ўрока выкарыстоўваюцца такія метады, як "Мудрая парада", "Рамонак", "Выніковы круг", "Камплімент" і інш.

Сутнасць метаду "Мудрая парада" заключаецца ў тым, што вучні ў канцы ўрока ў групе пішуць "параду" тым, хто яшчэ недастаткова зразумеў тэму ўрока. Пры выкарыстанні метаду "Выніковы круг" вучні працуюць у групах. Даецца адна хвіліна для падрыхтоўкі. Прадстаўнікі першай групы задаюць пытанні па тэме ўрока вучням другой групы. Апошнія адказваюць (працуюць па крузе). Метад "Рамонак ведаў" патрабуе папярэдняй падрыхтоўкі. Малюецца адзін вялікі рамонак, на рознакаляровых пялёстках якога напісаны пытанні па тэме ўрока. Вучні па чарзе адрываюць пялёсткі і адказваюць на галоўныя пытанні тэмы. З дапамогай гэтых метадаў у вучняў фарміруецца ўменне аналізаваць, параўноўваць, выдзяляць галоўнае.

Дадзеная публікацыя знаёміць з некаторымі інтэрактыўнымі метадамі, якія з'яўляюцца не мэтай, а сродкам актывізацыі пазнавальнай дзейнасці на ўроках беларускай мовы, падчас якой вучні атрымліваюць новыя веды, здабытыя ў працэсе ўзаемадзеяння. Менавіта такія веды стануць больш трывалымі, свядомымі, а гэта значыць, больш якаснымі.

Інтэрактыўныя метады і прыёмы дазваляюць за кароткі прамежак часу ўцягнуць у сур'ёзную дзейнасць увесь клас, убачыць у дзеянні кожнага вучня. Вынікам інтэрактыўнага ўзаемадзеяння заўсёды будзе сітуацыя поспеху, развіццё самастойнасці, творчага падыходу і пазнавальнай актыўнасці вучняў.

**Спіс літаратуры**

1. Босы, І.Ч. Актывізацыя пазнавальнай дзейнасці вучняў на ўроках беларускай мовы / І.Ч. Босы. // Беларуская мова і літаратура. — 2007. — № 4. — С. 3–7.
2. Бушыла, Н.В. Актывізацыя пазнавальнай дзейнасці на ўроках / Н.В. Бушыла. // Беларуская мова і літаратура. — 2006. — № 6. — С. 20–25.
3. Жуковіч, М.В. Сучасныя педагагічныя тэхналогіі на ўроках беларускай мовы і літаратуры: дапаможнік для настаўнікаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі / М.В. Жуковіч. — Мінск: Аверсэв, 2007. — 100 с.
4. Запрудский, Н.И. Современные школьные технологии — 2 / Н.И. Запрудский. — Минск: «Сэр–Вит», 2010. — 256 с.
5. Кашлев, С.С. Интерактивные методы обучения педагогике/ С.С. Кашлев. — Минск: Вышэйшая школа, 2004. — 175 с.
6. Паўлоўская, В.І. Мова: цікава і займальна / В.І. Паўлоўская. — Мінск: Народная асвета, 1998. — 254 с.
7. Подласый, И.П. Педагогика: новый курс: учебник для студентов высших учебных заведений: в 2 ч. Ч. 1 / И.П. Подласый. — М.: ВЛАДОС, 2003. — 528 с.
8. Солахаў, А.В. Займальны матэрыял па беларускай мове / А.В. Солахаў. — Мінск: Лексіс, 2004. — 262 с.


*Дата поступления в редакцию: 03.10.2022*

# ОНЛАЙН-ЗАНЯТИЯ В УСЛОВИЯХ СОВРЕМЕННОГО ЦИФРОВОГО ОБРАЗОВАНИЯ: АСПЕКТЫ ОРГАНИЗАЦИИ И ПРОВЕДЕНИЯ

*Молодовская Алеся Валерьевна*

***Аннотация.*** *Активная цифровая трансформация образования обусловливает необходимость использования современных компьютерных технологий в организации образовательного процесса. Сетевые ресурсы обладают рядом преимуществ в сравнении с традиционными формами обучения и предлагают широкий перечень инструментов для организации и проведения учебных занятий в режиме онлайн. В статье приводятся примеры использования сетевых сервисов при дистанционном обучении слушателей обучающих курсов Витебского областного института развития образования, определены особенности и возможности применения цифровых технологий в организации занятий онлайн.*

Цифровая трансформация стала реалией современного образовательного пространства. Цифровые технологии активно проникают во все сферы человеческой жизни, в том числе и в образование, где способны значительно повысить эффективность вовлечения учащихся в образовательный процесс, предоставить учителю инструменты персонализации обучения посредством предоставления учащимся материалов того уровня и качества, что соответствуют их познавательным запросам, траектории развития.

Согласно Концепции цифровой трансформации процессов в системе образования современный педагог учреждения общего среднего образования должен уметь анализировать собственную деятельность, выявлять наиболее значимые проблемы и находить эффективные пути их решения, осуществлять процесс обучения с использованием компьютерных технологий [1].

Как показывает практика проведения обучающих курсов в Витебском областном институте развития образования, использование средств информатизации позволяет оптимизировать педагогическую деятельность и создает принципиально новый интегрированный способ обучения.

Цифровая трансформация образования выражается в ряде изменений: использование интерактивных и мультимедийных досок на уроках, создание виртуальных учебных классов для организации дистанционной формы работы с учащимися, персонализация и геймификация образовательного процесса и др. При проведении в 2020 г. государственного статистического исследования по вопросу использования организациями информационно-коммуникационных технологий было установлено, что большинство учреждений образования Витебской области уже активно апробируют и внедряют новые виды информационных технологий, используют либо имеют возможность использовать интернет-услуги и интернет-сервисы. Более 90% педагогов выразили готовность выстроить свою профессиональную деятельность на основе использования инновационных средств обучения.

Одну из устойчиво ведущих позиций в числе средств информатизации в системе образования занимают облачные технологии, применение которых обеспечивает мобильность образовательных ресурсов. Облачная среда постоянно расширяет свои возможности и предлагает большой ассортимент образовательных ресурсов, с помощью которых можно создать уникальную площадку для профессионального взаимодействия педагогических работников, а также условия для непрерывного образования учащихся.

В современных условиях цифровой трансформации процессов системы образования особенно актуальными становятся идеи использования сетевых сервисов, их дидактического потенциала для органи-